# БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ ПОЛАЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

***канд. філал. навук, дац. культуралогіі С.М. САРОКА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

У сучасных інтэграцыйных працэсах, якія адбываюцца ў сусветнай культуры, атрымала новае гучанне і ўвайшла ў шэраг прыярытэтных накірункаў навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2011 – 2015 гады навуковая праблематыка па сацыякультурнай дынаміцы беларускага грамадства, па гістарычнаму развіццю беларускай мовы, літаратуры, мастацтву, па фарміраванні беларускай нацыі. Для Полаччыны, якая з'яўляецца гістарычнай калыскай беларускай дзяржаўнасці, асаблівую значнасць маюць аналітычныя даследаванні беларускай культуры ў кантэксце духоўна-маральнага і агульнасусветнага культурнага працэсу. Праблематыка гістарычнага развіцця беларускай культуры знаходзіць шматгранны адбітак у сучасных навуковых распрацоўках, якімі займаюцца філосафы, філолагі, гісторыкі, культуролагі, сацыёлагі, у тым ліку этнографы, антраполагі, археолагі, краязнаўцы Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

***Кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*** была заснавана ў Полацкім дзяржаўным універсітэце ў 2006 годзе; яе выкладчыкі чытаюць агульнаадукацыйныя дысцыпліны студэнтам геадэзічнага, інжынерна-будаўнічага, інжынерна-тэхналагічнага, машынабудаўнічага, радыётэхнічнага, спартыўна-педагагічнага, фінансава-эканамічнага, юрыдычнага факультэтаў. Першы загадчык кафедры – кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Л.В. Янкоўская; з 2009 года кафедру ўзначальвае кандыдат філасофскіх навук, дацэнт І.А. Бортнік. Сёння тут працуе 29 выкладчыкаў, з якіх 7 кандыдатаў навук. *Прыярытэтнымі накірункамі іх навуковай дзейнасці* з'яўляюцца *айчынная гісторыя, гісторыя філасофіі, культуралогія, сацыялогія, беларуская мова*. Дадзеныя накірункі гуманітарных даследаванняў ахопліваюць вельмі шырокую сферу навуковых інтарэсаў, але маюць і агульнае – амаль усе навуковыя распрацоўкі выкладчыкаў кафедры закранаюць ці непасрэдна арыентаваныя на праблематыку гістарычнага развіцця культуры беларусаў у сусветнай прасторы і часе.

За 6 гадоў існавання (2006 – 2012) кафедры колькасць *навуковых публікацый* ў айчынных і замежных перыядычных выданнях склала 92 артыкулы, у энцыклапедычных – 23, у зборніках навуковых канферэнцый – 143. Выдадзены 2 манаграфіі: Струкава С.М. Лексіка беларускай мовы: гісторыя і сучаснасць. – Мінск: Права і эканоміка, 2008. – 776 с.; Сарока С.М. Архітэктоніка інфармацыйнай прасторы беларускай культуры XIX – пачатку XX стагоддзя. – Наваполоцк: ПДУ, 2012. – 292 с. У калектыўных выданнях Нацыянальнай акадэміі Беларусі, Інстытута філасофіі і Інстытута гісторыі ў 2010 і 2012 гадах удзельнічалі кандыдат філасофскіх навук, дацэнт І.А. Бортнік і выкладчык І.У. Магалінскі. *Навукова-метадычную дзейнасць* кафедры выразна адлюстроўваюць 11 вучэбна-метадычных комплексаў: па *ідэалогіі беларускай дзяржавы* (Л.В. Янкоўская); *сацыялогіі* (С.У. Андрыеўская); *гісторыі* Беларусі (І.А. Бортнік, В.У. Якубаў); *беларускай мове* (С.А. Вялюга, А.І. Зянько); *паліталогіі* (Н.В. Даўгяла, Ю.А. Аўчыннікава); *этыцы* (А.В. Караткіх, Т.П. Слесарава, М.Я. Пашкевіч); *логіцы* (В.Б. Міхно); *філасофіі* (В.Б. Міхно); *культуралогіі* (С.М. Сарока); *Вялікай Айчыннай вайне савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны* (А.І. Корсак).

*Беларуская культура ў гістарычным працэсе развіцця сусветнай культуры* прадстаўлена ў даследаваннях супрацоўнікаў кафедры шматгранна, а навуковыя працы ахопліваюць значны прамежак часу – з X стагоддзя і па сучаснасць. Філалагічныя даследаванні *самабытнай мовы беларусаў у кантэксце функцыянавання старажытных усходнеславянскіх моў* вядзе кандыдат філалагічных навук, дацэнт С.М. Струкава. *Праблема талерантнасці, асаблівасці развіцця рэлігійнай і грамадска-палітычнай думкі на беларускіх землях у часы Сярэднявечча і Адраджэння* – гэта навуковая тэма кандыдата філасофскіх навук, дацэнта І.А. Бортніка. *Сацыяльна-палітычнае і канфесійнае становішча на землях Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай XVI – XVIII стагоддзяў* даследуе старшы выкладчык В.У. Якубаў. Навуковыя інтарэсы выкладчыцы кафедры К.Ю. Ерзікавай сканцэнтраваныя на *ладзе жыцця магнатаў, сярэдняй шляхты і гараджан Вялікага Княства Літоўскага ў XVI – XVII стагоддзях*. Адным з асноўных аб'ектаў навуковага аналізу І.У. Магалінскага з'яўляецца *прамысловая і бытавая вытворчасць на полацкіх землях X – XVIII стагоддзяў вырабаў з жалеза і каляровых металаў, ювелірных упрыгажэнняў*.

У гісторыю еўрапейскай культуры XIX стагоддзе ўвайшло пад назвай "эпоха стварэння нацыянальных дзяржаў", менавіта ў гэты час была выразна акрэслена беларуская культурная прастора, фарміраваліся асноўныя напрамкі беларусазнаўства як навукі ў межах славістыцы. У складзе Расійская імперыі пачаліся гісторыка-этнаграфічныя, геаграфічныя, археалагічныя навуковыя даследаванні традыцыйнай культуры беларусаў, узнік беларускі нацыянальны рух. *Сацыякультурная праблематыка XIX – пачатку XX стагоддзя на сучасных беларускіх землях* адлюстраваная ў навуковых даследаваннях кандыдата філалагічных навук, дацэнта С.М. Сарока, старшага выкладчыка А.М. Барун, выкладчыка А.С. Потрасавай і іншых.

Прадметам культуралагічнага аналізу С.М. Сарока з'яўляюцца інфармацыйныя працэсы на беларускіх землях у XIX – пачатку XX стагоддзя. Адраджэнне ў гэты час праваслаўных духоўных традыцый, дзейнасць праваслаўных манастыроў Полацкай епархіі – навуковая тэматыка старшага выкладчыка А.М. Барун. У сферы этналогіі, этнаграфіі і фалькларыстыцы традыцыйная культура беларусаў XIX – XX стагоддзяў прадстаўлена навуковымі распрацоўкамі кандыдата гістарычных навук, дацэнта С.У. Андрыеўскай, выкладчыкаў кафедры А.Ю. Бабіч, А.Б. Захарэвіч, І.В. Азевіч і іншых.

*Рэлігія як адна з асноўных форм духоўнай культуры* займае значнае месца ў навуковых працах супрацоўнікаў кафедры, яна выразна адлюстроўвае складаны працэс усталявання духоўна-маральных каштоўнасцей беларусаў. Канфесійную праблематыку савецкага часу на тэрыторыі БССР сёння даследуе старшы выкладчык Н.В. Даўгяла. У першай палове XX стагоддзя развіццё беларуска-польскіх кааперацый і нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі – навуковая тэматыка выкладчыка А.Л. Радзюк. Менавіта ў гэты гістарычны перыяд адбылося фарміраванне беларускай класічнай літаратуры і былі распрацаваныя нормы беларускай літаратурнай мовы ў БССР. Навуковыя даследаванні старшых выкладчыкаў А.І. Зянько і С.І. Красоўскага тычацца моўнай сферы і закранаюць асобныя аспекты развіцця беларускай літаратуры ў агульным літаратурным працэсе.

*Сучасная праблематыка жыццядзейнасці беларускага грамадства* шматгранна прадстаўлена ў індывідуальных працах кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Л.В. Янкоўскай, выкладчыка А.А. Аляміева і многіх іншых калектыўных распрацоўках супрацоўнікаў кафедры. Ідэалогія беларускай дзяржавы, патрыятызм, выхаванне студэнтаў на нацыянальных духоўных каштоўнасцях – гэта адзін з напрамкаў навуковай дзейнасці дацэнта кафедры Л.В. Янкоўскай і старшага выкладчыка Н.В. Даўгяла. У 2006 – 2010 гадах на кафедры была выканана дзяржбюджэтная навуковая тэма *"Вышэйшая адукацыя ў пераходным грамадстве: філасофска-светаўяўленчы аспект"* (навуковы кіраўнік Л.В. Янкоўская), сённяшняя кафедральная дзяржбюджэтная тэма – *"Метадалогія і методыка выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін"* (2012 – 2016 гг.). У межах гранта БРФФІ "Прыдзвінне-2009" праведзены дзве навукова-даследчыя працы: *«Міжканфесійныя адносіны ў Полацкім ваяводстве (другая палова XVI – першая палова XVII ст.)»* (навуковы кіраўнік – кандыдат філасофскіх навук, дацэнт І.А. Бортнік) і *«Традыцыі выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі беларускага Падзвіння ў канцы XIX – пачатку XXI стагоддзя»* (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.У. Андрыеўская).

Значнае месца ў навуковай дзейнасці супрацоўнікаў кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін займаюць **партнерскія сувязі з айчыннымі і замежнымі навукоўцамі** Польшчы, Германіі, Расіі, Украіны, Літвы. Стажыроўкі ў Варшаўскім, Ягелонскім, Беластокскім універсітэтах прайшлі ў розныя гады кандыдат філасофскіх навук, дацэнт І.А. Бортнік, старшы выкладчык В.У. Якубаў, выкладчык кафедры А.Л. Радзюк. У 2008 – 2011 гадах загадчык кафедры І.А. Бортнік і старшы выкладчык В.У Якубаў прынялі ўдзел сумесна з беларускімі, расійскімі і ўкраінскімі навукоўцамі ў распрацоўцы праекта *"Хрысціянства, іудаізм, іслам у гісторыі Еўропы. Параўнальная і міждысцыплінарная гісторыя еўрапейскіх рэлігійных традыцый"*, арганізатарам якога быў Цэнтр украіністыкі і беларусістыкі гістарычнага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта імя М. Ламаносава. У фундаментальным расійска-беларускім навуковым даследаванні, якое праводзілася на кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, "Фарміраванне і развіццё сістэмы беларуска-расійскіх міжрэгіянальных кантактаў: сацыякультурны і эканамічны аспекты (Полацк, Віцебск, Ноўгарад, Пскоў, IX – XX стст.)" (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, дацэнт Д.У. Дук) удзельнічала ў 2008 – 2011 гадах дацэнт кафедры С.М. Сарока. Сёння на кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін праводзяцца мерапрыемствы па ўсталяванню навуковага супрацоўніцтва з Апольскім універсітэтам (Польшча) і Каўнаскім універсітэтам імя Вітаўта Вялікага (Літва) у накірунку абмена навуковай інфармацыяй і выдання сумесных навуковых прац.

На працягу бліжэйшых гадоў у розных універсітэтах Рэспублікі Беларусь плануюцца абароны 11 распрацаваных супрацоўнікамі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін *дысертацыйных прац*, у якіх акцэнтаваная беларуская тэматыка: 1 доктарская дысертацыя па культуралогіі (С.М. Сарока), 8 кандыдатскіх дысертацый па гісторыі (В.У. Якубаў, В.Ю. Бабіч, А.Л. Радзюк, Н.В. Даўгяла, І.В. Магалінскі, Ю.С. Пракоф'ева, А.М. Барун, В.Г. Рымко), 1 кандыдатская дысертацыя па філасофіі (Л.А. Було) і 1 кандыдатская дысертацыя па сацыялогіі (А.А. Аляміеў).

Як можна зрабіць вынік, менавіта беларуская тэматыка ў кантэксце духоўна-маральнага і агульнасусветнага гістарычнага працэсу з'яўляецца сёння прыярытэтнай амаль ва ўсіх навуковых накірунках супрацоўнікаў кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.